Роднае слова. –2005. – № 8. – С. 22–25.

Гурская Ю.А.

КАНЦЭПТУАЛІЗАЦЫЯ ІМЯ ЎЛАСНАГА: ВОБРАЗ *РАГНЕДЫ* Ў РОЗНЫХ ТЫПАХ ТЭКСТУ

Ключавыя імёны культуры здольныя захоўваць культурную інфармацыю і функцыянаваць як згорнуты дыяхранічны нацыянальна-культурны тэкст. Асаблівае месца сярод значымых беларускіх імёнаў займае імя *Рагнеда*, якое заўсёды асацыявалася з непакорнасцю, Радзімай, Беларуссю, яе няпростым лёсам. Семы ‘вальналюбства’, ‘непакорнасць’ праходзяць праз многія творы рускіх, беларускіх аўтараў, аднак, у розных аўтараў гэта імя мае адрозны культурны фон. З гэтае прычыны для імя *Рагнеда* больш важныя канатацыі і асацыяцыі, чым намінацыя, г.зн. той культурны фон, які выходзіць на пярэдні план, актуалізуецца. Імя *Рагнеда* звязанае таксама з *Полацкам* – адным з найбольш значымых у беларускай культурнай свядомасці гаралоў.

Мы не ведаем асноўных датаў жыцця *Рагнеды*, нават года ці месца яе нараджэння. Захавалася толькі тры летапісных аповеды. Два з іх – “Аповесць мінулых гадоў” пад 980 год, Іпацьеўскі і Лаўрэнцьеўскі летапісы пад 1128 год – змяшчаюць эпізод сватання да Рагнеды Уладзіміра і Яраполка і наступныя за гэтым падзеі [10, 299–301]. У Цвярскім і Густынскім летапісах пад 988 годам паведамляецца пра падстрыжыны Рагнеды ў манахіні. Летапіс прыводзіць толькі год яе смерці – 1000.

На думку многіх даследчыкаў, якія прааналізавалі тэксты летапісаў на гістарычным і лінгвістычным узроўнях, аповед пра жаніцьбу Уладзіміра з Рагнедай уяўляе сабою больш познюю ўстаўку ў летапіснае апавяданне пад 980 годам, у аснове якой можа быць народнае казанне ці песня. Такой думкі трымаліся А.Шахматаў, М. Доўнар-Запольскі, Б.М. Сакалоў, М. Кастамараў, Дз. і інш. [6, 58 –59; 7, 62; 12; 16, 90-121; 17, 90-91; 22, 173-175].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А. Шахматаў у сваім даследаванні прыходзіць да высновы, што абодвы летапісныя расказы пад 980 годам і пад 1128 годам узыходзяць да асобнага казання, якое ў поўным выглядзе ўвайшло ў летапіс толькі ў пачатку XIV стагоддзя [22, 174]. На гэта паказвае і шэраг тэкстуальных супадзенняў паміж запісамі 980 і 1128 гг. Як асабліва значымыя ў іх выступаюць словы Рагнеды: *не хочу розути робынича, но Ярополка хочу*, у якіх такія інтанацыйна-сінтаксічныя сродкі, як эліпсіс, экспрэсіўна падкрэсленая форма дзеяслова 1 асобы з апушчаным дзейнікам перадаюць перажыванае гераіняй пачуццё вялікага напружання і хвалявання. Варта зазначыць, што летапісная формула "не хочу розути робынича", увайшла ў кадыфікаваную беларускую мову і ў "мову магчымых светаў" у якасці фразеалагізма – 'не хачу прыніжацца перад чужынцамі, скарыцца перад чужой воляй', паўплывала на канатацыю вобраза Рагнеды ў розных аўтараў (гэтыя словы скарыстаў у якасці эпіграфа Янка Купала да сваёй паэмы "Гарыслава", іх прыводзяць у сваіх творах К.Тарасаў, В.Іпатава і інш.).

А.Шахматаў лічыў, што першапачатковую версію захаваў Лаўрэнцьеўскі летапіс 1128 г., які, нягледзячы на шэраг тэкстуальных супадзенняў, мае і істотныя адрозненні ад "Повести временных лет" (менавіта ў Лаўрэнцьеўскім летапісу з'яўляецца вобраз Дабрыні-свата). Відаць, на гэты летапіс абапіраліся ў беларускай паэзіі Янка Купала, а ў рускай – К.Ф.Рылееў, І.А.Аўтамонаў.

Аб папулярнасці казанняў пра Рагнеду ў Старажытнай Русі сведчаць, як лічуць даследчыкі, Цвярскі і Густынскі летапісы пад 988 годам, дзе гаворка ідзе пра рашучую адмову Рагнеды на прапанову Уладзіміра выйсці замуж за каго-небудзь з яго вяльможаў пасля таго, як ён прыняў хрысціянства: "…*азъ же, бывъ царицею, не хощу раба быти царю, ни князю, но уневестися хочу Христове, въсприиму ангельский образ*" [19, 112-113]. Летапіс паведамляе пра падстрыжыны *Рагнеды* ў манахіні і надзяленне яе трэцім, хрысціянскім, імем – *Анастасія* (грэч. 'уваскросшы', 'адроджаны'). Гэтае імя, як мяркуе Б.М. Сакалоў, было захаванае вусным шляхам праз

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

быліны пра жаніцьбу князя Уладзіміра [16, 99]. Рагнеда стала першай на Русі хрысціянкай. Праз усе тэксты летапісаў праходзіць сема ‘вальналюбства’, што знайшло адлюстраванне і ў “мове магчымых светаў”.

Даследчыкі выказваюць розныя пункты гледжання на паходжанне імёнаў *Рагнеда*, *Рагвалод*. Частка вучоных залічвае іх да славянскіх. Да прыкладу, імёны Рагнеда і Рагвалод прыводзяць М.Марошкін, С.Б. Весялоўскі [11, 4]. З іншага боку, М.Фасмер падае імя *Рагнеда* (Рогньдь) як запазычанае са скандынаўскага – Ragnheidr [21, 490]. Прысвяціўшы гэтай праблеме спецыяльную работу, Б.М.Сакалоў атаясамлівае вобраз Рагнеды з архетыпам дзевы-ваяўніцы[1], звязваючы яго з сюжэтам з германскага эпасу (у прыватнасці, з казаннямі пра жаніцьбу Гунтара на Брунхільдзе). Асобныя вучоныя мяркуюць, што ў летапісы гэты сюжэт трапіў з германскага народнага эпасу.

Тым не менш, нягледзячы на такія супярэчлівыя і мізэрныя звесткі, пра Рагнеду напісаныя літаратурныя творы на беларускай, рускай і ўкраінскай мовах: дума К. Ф.Рылеева “Рагнеда”, верш Т.Шаўчэнкі “Цары”; імёны *Рагнеда* і *Рагвалод* узгадваюцца ў вершах В.Хлебнікава, створаная таксама паэтычная і празаічная *Рагнедзіяна* на беларускай мове [2]. Гэтыя творы можна разглядаць толькі як надзвычай **“**магчымыя светы**”.** На падставе розных тыпаў тэкстаў у мове “магчымых светаў” быў створаны вобраз *Рагнеды*, дзякуючы ўпершыню ў беларускай паэзіі звярнуўся Янка Купала.

Вобраз Радзімы, Беларусі Янка Купала прапанаваў як нацыянальную ідэю, звязаную з імем *Рагнеда*. Праз гэтыя асацыяцыі ўзнікае паралель *Беларусь – нявеста*, рукі якое просяць некалькі жаніхоў (згодна з летапісамі да Рагнеды адначасова сваталіся Уладзімір і Яраполк). Такія асацыяцыі

[1] Вобраз дзевы-ваяўніцы, які асацыюе з вобразам Рагнеды, як лічаць даследчыкі, трапіў у рускую літаратуру праз Беларусь. Упершыню гэты вобраз увёў у рускую літаратуру М.Лермантаў у паэме “Ліцвінка” (1832), у якой ідэя свабоды звязваецца з вобразам Ліцвінкі і з Літвой. У літаратуразнаўстве разглядваюцца версіі пра залежнасць / незалежнасць гэтай паэмы ад твора А.Міцкевіча “Гражына”, дзе гаворка ідзе таксама пра дзеву-ваяўніцу, ліцвінку родам з г. Ліда, якая стала жонкай навагародскага князя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

праходзяць праз многія дарэвалюцыйныя творы Янкі Купалы (“Гарыслава”, “Бандароўна”, “Паўлінка”).

Пры гэтым адным з кампанентаў ідэі ёсць тое, што лёс Беларусі быў як бы прадвызначаны лёсам полацкай княжны: Рагнеда сваёй гордасцю і пакутамі іскупіла свабоду. Такім чынам паэт праводзіць думку, што свабода і слава прыходзяць толькі праз пакуты.

Асацыяцыі, звязаныя з імем *Рагнеда*, жывыя да гэтага часу – як толькі ўзнікае ідэя нацыянальнага адраджэння, у беларускай культурнай свядомасці актуалізуецца імя *Рагнеда*. Не выпадкова імя *Рагнеда* было названае ў час апытання, праведзенага намі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце ў 1994 годзе сярод студэнтаў філолагаў як адно з самых значымых для нацыянальнай самасвядомасці.

У 1995 годзе спектаклем “Страсці (Рагнеда)” адкрыўся сезон Мінскага тэатра оперы і балета. У 1996 годзе “Страсці” былі прызнаныя лепшым спектаклем года ў Парыжы.

У той жа час у рускай мастацкай літаратуры гэта імя, як правіла, разглядваецца ў кантэксце рускай гісторыі, і першы аўтар, які звярнуўся да гэтага вобразу, быў К.Ф. Рылееў. Несумненна, дума (аповесць) К.Ф. Рылеева “Рагнеда” была навеяна беларускімі ўражаннямі.[1]

Пра тое, што імя полацкай княжны жыло ў свядомасці народу, сведчаць народныя паданні, легенды пра Рагнеду, якія яшчэ ў XIX стагоддзі запісвалі беларускія фалькларысты. У прыватнасці, Е.Раманаў прыводзіць легенду, якая тлумачыць паходжанне беларускіх прозвішчаў у наіўнай карціне свету, дзе *Рагнеда* паўстае як прамаці беларускага народа. Імя *Рагнеда* захавалася і ў беларускай антрапаніміцы, тапаніміцы, гідраніміі. На Віцебшчыне (Лепельскі, Ушацкі р-ны) намі зафіксаванае прозвішча *Гарыслаўка*, на Смаленшчыне вядомае – *Рогнедин* [8, 81]. У сучасным Заслаўі адно з азёраў называецца *Рагнедзь*; два прытокі ракі Свіслач носяць

[1]з гісторыяй Рагнеды К.Ф. Рылееў пазнаёміўся ў час вайны 1812 года ў Полацку, дзе стаяў яго полк [].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

назвы *Княгінька* і *Чарніца*, якія гэтаксама асацыююць з вобразам Рагнеды. На рацэ Дзвіна знаходзіцца старажытнае мястэчка Краслаўка < Гарыслаўка, названае, відаць, па другім імені Рагнеды – Гарыслава [2, 357].

Тэкст К.Ф. Рылеева "Рагнеда" стаў "прэцэдэнтным" для многіх рускіх аўтараў. Можна меркаваць, што вобраз *Рагнеды* ў пэўнай ступені паўплываў на вобраз Таццяны Ларынай у Пушкіна ў "Яўгене Анегіне".

Разгледзім больш падрабязна думу К.Рылеева "Рагнеда". Дума напісана чатырохстопным ямбам; складаецца з васьмірадкоўяў, складзеных з двух чатырохрадкоўяў перакрыжаванай рыфмоўкі; у ёй назіраецца чаргаванне мужчынскіх і жаночых рыфмаў. Аналіз мовы, метра, рытму, спосабу рыфмавання думы прыводзіць да высновы пра сувязь паэмы "Рагнеда" з мовай, метрам, строфікай "Яўгена Анегіна" Пушкіна[1].

Рылееў	Пушкін
Воздвигся Полоцк. Рогволод	Мой дядя самых честных *правил*,
Приветливо и кротко *правил*	Когда не в шутку занемог,
И, привязав к себе народ,	Он уважать себя *заставил*
Власть князя уважать *заставил*…	И лучше выдумать не мог…

Дума К.Рылеева "Рагнеда" прысвечаная А.А.Ваейковай, вядомай у літаратуры як прататып "Святланы" В.Жукоўскага. Такім чынам, "Рагнеда" асацыятыўна звязваецца з вобразам Святланы Жукоўскага, на што паказвае шэраг ключавых словаў, вобразаў думы (параўн. анаграму імя *Святлана* ў паэме К. Рылеева ў такіх словах, як *свет*, *светлица*, *светоч*, *луна*).

Можна адзначыць зыходжанні і пераклічкі паміж вобразамі Рагнеды і Таццяны ў "Яўгене Анегіне", пятая глава якога ў якасці падтэксту таксама мяркуе "Святлану" Жукоўскага.

Пушкін	Рылееў
…Скажи: которая Татьяна?	
■ Да та, которая *грустна*	<…> Когда же будешь веселей,

[1] звяртае ўвагу, што "Рагнеда" К Рылеева і першыя главы "Яўгена Анегіна" напісаны прыблізна ў адзін і той жа час.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

И молчалива, как *Светлана* Когда *грустить* ты перестанешь?

(V, III)

<…> И вот она одна. *Все* было *тихо*…лишь поток,

Все тихо. *Светит ей луна*. Журча, роптал между кустами…

(XXI, III)

И *утренней* луны *бледней* Как месяц *утренний бледна*

(XXX, V)

И часто целый день *одна* Рогнеда в горести глубокой

Сидела молча *у окна* Сидела с сыном у окна…

(XXV, II)

Такім чынам, на вертыкальным кантэксце вобраз *Рагнеды* суадносіцца з вобразамі Святланы В. Жукоўскага і Таццяны А.С.Пушкіна.

Згодна з Р.Бартам, асабліва значымым у мастацкім творы з'яўляецца імя ўласнае пераснажа, яго сацыяльныя і сімвалічныя канатацыі. У паэме К.Рылеева да такіх імёнаў можна аднесці імёны *Рагнеда*, *Рагвалод*, *Ізяслаў*, *Уладзімір*.

К.Рылееў выкарыстоўвае розныя спосабы актуалізацыі онімаў. Можна адзначыць выкарыстанне асабліва значымага імя героя альбо ўстойлівага яго наймення ў пачатку наступнага радка ў канцы метрычнага перыяду (прыём, распаўсюджаны ў "Яўгене Анегіне"): <…> *Как месяц утренний бледна*, / ***Рогнеда*** *в горести глубокой*; <…> *Об нем, как гром гремящий слава…*/ ***Рогнеды*** *вид покойней стал…*/ ; <…> *Княгиня*! – *он вещал, войдя*: -- / *Гоня зверей в дубраве смежной*, / ***Владимир*** *посетить тебя…*/ *Прибудет в терем твой прибрежный…*

Пачатковы радок страфы часта распадаецца на самастойныя замкнёныя сказы такім чынам, што антрапонім пасля паузы аказваецца інтанацыйна і семантычна вылучаным: *Воздвигся Полоцк.* ***Рогволод*** / *Приветливо и кротко правил…*/; <…> *Сам* ***Рогволод****… Вдруг тяжкий стон* <…>.

Супадае таксама метрычная граніца і онімы *Рагнеда*, *Рагвалод*, *Ізяслаў*, пастаўленыя ў пазіцыю пераносу: *Воскреснет храбрый Рогволод* / *В делах и*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чадах Изяслава / *И пролетит из рода в род* / *Об нем, как гром гремящий слава* //, дзе семантычныя рыфмы *Рогволод – народ*; *Рогволод – род* актуалізуюць паэтычную этымалогію імя.

К.Рылееў прапаноўвае і ўласную этымалогію оніма *Рагнеда*, суадносячы яго са словамі *огнь*, *горесть*: <…> *Как месяц утренний, бледна* / ***Рогнеда*** *в горести глубокой* //; *И пред собой Рогнеду зрит…*/ *Ее глаза огнем пылают*.

Змешчанае ў пачатак радка імя *Рагнеда* ўваходзіць і сінтаксічнае адзінства сінтагмы *Как месяц утренний, бледна* і ў рытмічнае адзінства радка ***Рогнеда*** *в горести глубокой*, прычым семантычная матывіроўка імя *Рогнеда – горесть* з'яўляецца алюзіяй на яе другое імя – *Гарыслава*. Імя *Рогнеда* матывуецца таксама назоўнікам *огнь* (паказальны выбар стылістычна высокага варыянту *огонь-огнь*): <…> ***Рогнеды*** *вид покойней стал*; / <…> *Но в них какой-то* ***огнь*** *сверкал* <…>, дзе лексему *огнь* можна разглядаць як паўторны фанемны комплекс, якія становіцца своеасаблівай аказіянальнай карнявой марфемай.

Лексема *агонь*, якая характарызуе *Рагнеду*, у кантэксце паэмы супрацьпастаўленая лексеме *цемра*, якая характарызуе *Уладзіміра* і яго дружыну, што заснавана на рэалізацыі больш агульнай культурнай апазіцыі *святло – цемра*. У асацыятыўнае поле 'святла' ўваходзяць мікрапалі з ключавымі лексемамі *огонь*, *солнце*, *луч*, *луна*, *пламень*, *страсть*, *любовь*, *свобода*, *сверкать*, *пылать*; у асацыятыўнае поле 'цемра' – *мрак*, *смерть*, *хлад, губитель*, *тризна*, *злодейство*, *тиран.*

Асабліва значымым у паэме ёсць асацыятыўнае поле 'плачу', куды трапляюць дзеясловы *плакать*, *грустить*, *горевать*, *выть* і аддзеяслоўныя дэрываты *плач*, *стон*, *вопль*, *рыданье*, якія ўяўляюць сабой градацыйны шэраг сімвалічнага значэння.

Дзеясловы асацыятыўнага поля 'плачу' ўваходзяць у больш шырокае асацыятыўнае поле 'чалавечае', што супрацьстаіць у паэме полю 'прыроднае'. Плач Рагнеды можна разглядаць як алюзію на "Слова пра паход Ігаравы", ён узыходзіць да старажытнага жанру галашэнняў і набывае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асаблівую экспрэсіўнасць на фоне смеху Уладзіміра і яго дружыны: <…> *Все веселятся…но грустит* / *Одна Рогнеда молодая* //; <…> *Вдруг тяжкий стон* / *И вопль отчаянья Рогнеды* / *Перерывают гуслей звон* / *И радость шумную беседы…* //.

На думку даследчыкаў, у язычніцкіх уяўленнях смяюцца дэманічныя істоты, якія належаць да ніжэйшага свету, часта смяюцца мучыцелі, што суадносіцца з характарыстыкай Уладзіміра на тэкставым узроўні: *тиран* – 3, *губитель* – 2 (слова *тиран*, як правіла, трапляе ў сільную пазіцыю пераносу: <…> *С каким восторгом бы тебя*, / *Тиран, угасшего узрела* /.

Такім чынам, у творы К.Рылеева ў імя *Рагнеда* можна вылучыць асноўныя семы ‘свабодалюбства’, ‘святло’, ‘гора’.

Дума К.Рылеева заканчваецца прабачэннем Рагнеды; яе далейшы лёс бачыўся асабліва важным для лёсу Полацкага княства, бо з часу ссылкі непокорлівай Рагнеды ў Заслаўе ўзнавілася дынастыя полацкіх князёў, самых непакорных**,** па словах М.В.Гогаля, якія заўсёды імкнуліся да абсалютна асобнай незалежнасці [3, 133 – 134].

Так склалася ў жыцці *Рагнеды*, што яна мела тры імені: *Рагнеда*, *Гарыслава*, *Анастасія*. З імем *Рагнеда* асацыюе нацыянальная ідэя свабоды, пакутаў; імя *Гарыслава* паглыбляе гэтую канатацыю. Найменш вядомае яе імя *Анастасія* (грэч. ‘уваскросшая’, ‘адроджаная’) звязанае з трэцім этапам яе жыцця, а таксама асацыюе з ідэяй адраджэння Беларусі.

У выніку даследавання розных тыпаў тэксту намі быў складзены семантычны профіль (па Е.Бартміньскаму) імя-канцэпта *Рагнеда*, які ўключае 7 фасет.

1. *Рагнеда* – сімвал Беларусі (Янка Купала). Паўторныя намінацыі *маладая* (*невеста*), *красавіца* , рукі якой дамагаецца некалькі жаніхоў.

2. Сімвал нацыянальнай “волі, гордасці і славы”. Імя *Рагнеда* ўваходзіць у семантычныя палі *воля*, *незалежнасць*, *слава*, *гонар*. Канцэптуальныя метафары – *даўняй волі дзяўчына* / *княства вольнага кветка* (І. Багдановіч), *вольная птушка* (С.Тарасаў), *волат*, *асілак духу* (Л.Шпакоўскі - Случанін).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Намінацыі: *гордая і палымяная, нескароная, княжна свабодная, мяцежны, нескароны дух* (Янка Купала, К.Тарасаў); яе імя ставіцца ў адзін сэнсавы шэраг “з імёнамі Глеба, Кастуся, Багушэвіча, Янкі” (М.Танк).

3. Сімвал нацыянальнага адраджэння. Паўторныя намінацыі: *патрыётка* (блізкасць да роднага краю і яго каранёў), *верная дачка свайго краю*; аддаўшая жыццё за волю і народ (Л. Шпакоўскі-Случанін). Патрыятызм у адносінах да рускай гісторыі: *запальвала ў сэрцах “любовь к стране родной и к угнетателям презренье”* (К.Рылееў).

3.1. *Адраджэнка нашае дзяржаўнасці* (імкненне абудзіць дзедаву славу і гонар), на думку гісторыкаў, паэтаў, пісьменнікаў *Рагнеда* дапамагла адрадзіць полацкую княскую дынастыю, вырашыла лёс “зямлі крывічоў”.

4. Рагнеда – *зыходная падзея, пачатак* нацыянальных вытокаў, знакавая постаць у гераічным і пакутлівым шэсці продкаў, адна з першадзейных асоб роднай гісторыі. З яе пачынаецца адлік гісторыі Беларусі, яна ўзбуйніла нацыянальную свядомасць, вывела Беларусь з небыцця на арбіту сусветнай гісторыі (Янка Купала, П.Крэчэўскі, Д.Леанардаў, М.Ермаловіч, Т.Бондар, І. Чыгрынаў).

5. *Нетрадыцыйная князёўна*. Яркая асоба, вельмі рашучая і самаахвярная жанчына, адданая радзіме, якая мела незвычайнае жыццё, *самавітая, неардынарная, гордая* і *палымяная, не скароная, мужная, гнеўная Рагнеда - Гарыслава*

6. *Пакутніца* (К.Тарасаў), *ахвяра, няшчасная крывіцкая княгіня, гораснае жыццё*, адна з самых трагічных, складаных, і… светлых постацей на небасхіле беларускай гісторыі (А.Марціновіч), *само тная*, пакутніца (Г.Запартыка, В.Чаропка). Гарыслава.

7. Сакралізацыя *Рагнеды*. 7.1. *Хрысціянская традыцыя*. Анастасія. Повторные намінацыі “нявеста Хрыстова”, *Рагнеда – апостал духа, святая*, (ёй прысягаюць), *чарніца*, заслужыла нябеснае бласлаўенне, паказала шлях да моцы духоўнай – узвышацца сэрцам, розумам, душою.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

7.2. Славянская міфалагічная традыцыя. Паўторныя намінацыі – *раз'юшаная мядзведзіца* (І. Чыгрынаў), *волат* (М.Танк), *птушка*, *кветка*, *палымяная*, *чароўная*. Яна асвятляе шлях нашчадкаў, яе стыхіі – Зніч, свет, сонца, агонь (К.Рылееў, І. Багдановіч, А.Хатэнка, В.Шніп і інш.).

Мы разгледзелі фрагмент дыяхранічнага нацыянальна-культурнага тэксту імя *Рагнеда*. Пра тое, што гэтае імя – згорнуты дыяхранічны культурны тэкст, сведчаць творы сучасных беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, а таксама іншыя нацыянальна-арыентаваныя тэксты пра Рагнеду.

1. Р.Барт. Избранные работы: Семиотика. Поэтика.– Москва: Прогресс, 1994.
2. Бацькаўшчына. Зборнік гістарычнай літаратуры. – Мінск: Юнацтва, 1999.
3. С.Букчин. "…Народ издревле нам родной". Русские писатели и Белоруссия. – Мінск: Лимариус, 2003.
4. С.Б.Веселовский. Ономастикон. Древнерусские имена, прозвища и фамилии. – Москва: Наука, 1974.
5. Ю.А.Гурская. Рогнеда в белорусской и русской поэзии// Образ человека в культуре и в языке. Логический анализ языка. – Москва: Индрик, 1999.
6. В.Е.Данилевич. Очерк истории Полоцкой земли. - Киев, 1896.
7. Д.И.Иловайский. История России. – Москва, 1876, т.1.
8. И.А.Королева. Фамилии Смоленского края сегодня. Материалы для словаря. – Смоленск: СГПУ, 2003.
9. Янка Купала. Паэмы. Драматычны творы. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1989.
10. Лаврентьевская летопись // Полное собрание русских летописей. – Москва:, 1962, т.1.
11. М.Морошкин. Славянский именослов, или Собрание славянских имен в алфавитном порядке. – Спб., 1867.
12. М.П.Погодин. Древняя русская история до монгольского ига. М., 1872, т.1.
13. С.М.Прохорова. Национально-культурный компонент в тексте // Доклад на VIII конгрессе МАПРЯЛ. – Мінск: БГУ, 1994.
14. А.С.Пушкин. Сочинения в трех томах. – Минск: Мастацкая літаратура, 1986, т.2.
15. К.Ф.Рылеев. Рогнеда // Полоцкий летописец. Историко-литературный журнал.– Полоцк, 1992, №1.
16. Б.М.Соколов. Германо-русские отношения в области эпоса.Эпические сказания о женитьбе князя Владимира//Ученые записки Саратовского университета, 1923, т.1. вып. 3.
17. С.М.Соловьев. История России с древнейших времен. – Москва: АСТ; Харьков: Фолио, 2001, т. 1.
18. К.Тарасов. Три жизни княгини Рогнеды. Минск: Коллегиум, 1994.
19. Тверская летопись. Полное собрание русских летописей. – Москва, 1965, т.XV.
20. В.Н. Топоров. Праславянская культура в зеркале собственных имен // XI Международный съезд славистов. – Москва: 1993.
21. М.Фасмер. Этимологический словарь русского языка. – Москва: Прогресс, 1986, т.3.
22. А.А. Шахматов. Разыскания о древнейших русских летописных сводах. – Спб, 1908.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ